Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Пейджинговую связь "ГС" обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис".
ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

№44 (230). 1 — 7 лістапада 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 200 руб.

Чытайце на старонках "ГС"

РЭПАРТАЖ З "ЗОНЫ"

17 і 18 кастрычніка гэтага года 9 журналістаў недзяржаўных газет правялі аўтамабільны рэйд па пацярпелых ад радыяцыі раёнах Гомельскай вобласці. Мэтай камандзіроўкі было на свае вочы ўбачыць і даведацца, што там адбываецца, як жывуць людзі праз 15 гадоў пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС.
Ад "Газеты Слонімскай" у "зоне" пабываў Мікола Кvotanaновіч.

(Працяг на 14 стар.)



Фота Уладзіміра БАЗАНА

НАВІНЫ

Дэлегаты на настаўніцкі з'езд

2 і 3 лістапада ў Мінску пройдзе II з'езд настаўнікаў Беларусі.

Дэлегатамі на педагагічны форум ад горада Слоніма паедуць загадчык гарадскога аддзела адукацыі Аркадзь Бумагін, настаўніца хіміі СШ №8 Алена Дзюба, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце СШ №4 Ірына Чыгрына і выхавацель дзіцячага садка №20 Надзея Піpoжнік.

Вясковых настаўнікаў на з'ездзе будуць прадстаўляць Аляксандр Матвеення з Новадзевяткавіцкай школы, Станіслава Казлова з Партызанаўскай і загадчык Слонімскага раённага аддзела адукацыі Галіна Шмялёва.

Адключылі тэлефоны

На многіх прадпрыемствах Слоніма і раёна ў кастрычніку замоўклі службовыя тэлефоны.

За больш як месячную няўплату тэлефоннай сувязі былі пазбаўлены птушкафабрыка, цэнтральная раённая бальніца, гарадскі і раённы аддзел адукацыі, школы горада і раёна, большасць калгасаў, акцыянерное таварыства "Праметэй", гаркам БПСМ, раённая санстанцыя, зубапратэзная майстэрня і іншыя прадпрыемствы і ўстановы.

Мікола КАНАНОВІЧ

Праезд на аўтобусах стаў даражэйшы

На 30% павялічыўся кошт праезду ў прыгарадных і міжгародных аўтобусах.

Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведаміла намеснік дырэктара па перавозках Слонімскага аўтапарка Валянціна Жук.

Відаць, хутка падаражэе і праезд у гарадскім транспарце.

Сяргей ЧЫГРЫН

Курсы обмена валют в г.Слониме по состоянию на 30 октября 2001г.

"Приорбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1505	1540
1 DM	670	705
1 RUR	50	52
"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1510	1525
1 DM	680	705
1 RUR	50	52
АК "Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1510	1540
1 DM	660	695
1 RUR	50	52
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1500	1520
1 DM	650	690
1 RUR	50	52
Нацбанк РБ		
1 EURO	1358.79	

Цены на слонимском рынке по состоянию на 30 октября 2001г

Продукт	Цена за кг
Гранаты	4000
Бананы	1100
Апельсины	1500 — 1600
Яблоки	200 — 400
Перец	800
Помидоры	1000 — 1400
Капуста	250 — 450
Морковь	300 — 500
Лук	450 — 600
Чеснок	1500
Картофель	150 —300
Молоко	250
Творог	700 — 800
Масло	3000
Яйца	1000 — 1300
Свинина	2500 — 4000
Говядина	2300 — 4000
Баранина	3500 — 4000
Сало	3000 —3500
Телятина	3500 —3800
Мед	5500 — 6000
Сметана	1000 — 1200
Лимоны	1700
Арбуз	200 — 300

ЧАСТНЫЙ БИЗНЕС ДОЛЖЕН ЗАЩИЩАТЬ СВОИ ИНТЕРЕСЫ

85 процентов опрошенных социологами предпринимателей заявили, что вынуждены давать взятки представителям органов власти.

Таковы данные опроса, проведенного в июле-августе 2001 года консультантами Международной финансовой корпорации (МФК).

На анкету ответило 335 предпринимателей.

44 процента респондентов отметили, что дают взятки "изредка", а 41 процент постоянно дают взятки чиновникам. И 15 процентов опрошенных считают, что такого явления, как взятки, не существует.



Практика общения "один на один" (с покупателями)

93 процента белорусских предпринимателей считают, что частный бизнес должен защищать свои интересы перед государством.

Ответы на вопрос "Как наиболее эффективно предприниматели могут защищать свои интересы перед государством?" показали, что не все респонденты четко представляют, что надо делать. Большинство — 58 процентов считают, что для этого лучше всего объединяться в профсоюзы, которые и будут лоббировать интересы частного бизнеса в органах власти. 16 процентов считают, что для них проще продолжать практику общения "один на один" с нужным чиновником. 6 процентов знают "другой" путь защиты своих интересов перед государством, но никто из них не указал, какой именно. И 20 процентов опрошенных затруднились определить наиболее эффективный путь защиты своих интересов.

БелаПАН

НА ДАРОЗЕ Ў ЗАЎТРА

Клопатная гаспадарка дасталася Анатолю Мікалаевічу Былічу, дырэктару спецшколы- інтэрнат, што знаходзіцца ў вёсцы Масты Правыя. Тут навучаюцца дзеці-сіроты і дзеці з неблаганадзейных сем'яў з усёй Гродзенскай вобласці.

На сённяшні дзень там вучацца 164 школьнікі. Большасць з іх трапілі ў школу-інтэрнат з Гродна, Гродзенскага і Мастоўскага раёнаў.

Гісторыя гэтай школы пачынаецца з 1945 года. На той час там месціўся інтэрнат для дзяцей-сірот. Ён знаходзіўся ў былым панскім маёнтку, які, па меркаваннях гісторыкаў, быў пабудаваны ў 1820 годзе. Новы корпус установы быў збудаваны ў 60-я гады мінулага стагоддзя.

Гаспадарка ў дырэктара школы, сапраўды, клопатная і вялікая. На 164 вучні прыходзіцца 24 настаўнікі, 28 выхавацеляў, а, увогуле, у школе працуе 105 чалавек. У гаспадарцы ёсць 2,18 га ворыўнай зямлі, свой трактар, аўтобус, грузавік, яшчэ конь ды 4 свінні. У дзяцей вялікая падтрымка са свайго агароду: агуркі, капуста, морква, буракі ды шмат іншай агародніны. Саленне і квашэнне дырэктар робіць сам асабіста. Яму дапамагаюць настаўнікі і вучні.

Дзеці сюды ў большасці сваёй паступаюць хворыя, бо ў тых сем'ях, дзе яны жылі, адносіны іх з бацькамі былі не самыя лепшыя. Калі настаўнікі звычайных школ кажуць пра педагагічныя цяжкасці, то тут працаваць удвая цяжэй. Дырэктар школы-інтэрната ганарыцца сваім калектывам. У першую чаргу, настаўнікамі пачатковых класаў Таццянай Клінцэвіч, Галінай Аксёнавай, настаўнікамі Кацярынай Саўчук, Алінай Саўчук, выхавацелямі Ліліяй Сайко, Вольгай Карповіч, Людмілай Кіслай.

На сённяшні дзень, як лічыць дырэктар школы, асноўная задача калектыва — даць гэтым дзецям "пуцёўку ў жыццё", зрабіць усё, каб яны змаглі як мага лепш у будучым вырашаць свае жыццёвыя праблемы. А тут для гэтага, сапраўды, створаны нармальныя ўмовы. Акрамя асноўных заняткаў хлопчыкі навучаюцца сталярнай і слясарнай справе, дзяўчаты вучацца шыць і гатаваць ежу. Сваімі рукамі дзеці робяць сабе дабрабыт.

Дапамагаюць школе ААТ "Мастоўдрэў", саўгас "Мастоўскі" і іншыя прадпрыемствы вобласці. Аблспажыўсаюз падараваў халадзільнік "Атлант". Дапамагае беларускі дабрачынны фонд "Дзеці ў бядзе". Існуюць прамыя стасункі з нямецкім горадам Бэдбург, жыхары якога перыядычна прывозяць дзецям гуманітарную дапамогу. Акрамя таго, 20 вучняў спецшколы штогод ад аднаго да трох месяцаў жывуць у нямецкіх сем'ях.

Вось так і жыве Мастоўская школа-інтэрнат. А іх у Беларусі болей за 190.

Язэп ПАЛУБЯТКА



У вучэбным класе Правамастоўскай спецшколы-інтэрната

НАВІНЫ

Райвыканкам прапануе

Вельмі дзіўны адказ атрымалі арганізатары правядзення 2 кастрычніка ў Мастах мітынгу ў абарону працоўных.

Райвыканкам не забараніў і не дазволіў правядзенне гэтага мерапрыемства. Улады проста прапанавалі перанесці яго правядзенне на іншы дзень, спаслаўшыся на ўказ прэзідэнта, які дазваляе ў гэты дзень святкаваць Дзень Памяці.

Традыцыйны сельскагаспадарчы кірмаш

У суботу на пляцоўцы ля стадыёна "Нёман" у Мастах прайшоў традыцыйны сельскагаспадарчы кірмаш.

Усе гаспадаркі мелі свае павільёны. Сярод іх быў праведзены конкурс на лепшы эстэтычны выгляд.

Найбольшым попытам у людзей карысталіся капуста, морква, збожжа.

Самадзейныя артысты з сельскіх дамоў культуры ладзілі канцэрты.

Язэп ПАЛУБЯТКА

8 тонн для офицеров

Этой осенью военнослужащие 11 механизированной бригады помогали колхозу имени Суворова Слонимского района в уборке урожая.

В ответ руководство колхоза выделило для офицеров бригады 8 тонн картофеля по ценам ниже рыночных.

307 вместо 571

До конца года в слонимской бригаде должен быть уволен в запас 571 солдат.

На замену этому числу военнослужащих в бригаду придет 307 человек из учебных подразделений вооруженных сил Беларуси. Оставшийся некомплект солдат будет дополнен за счет призывников, большинство которых будет призвано из Слонима и Слонимского района.

Валерий КОВАЛЕНКО

ПРАБЛЕМА

У ВІШАВА – НА РОВАРЫ

На сённяшні дзень 77 настаўнікаў, якія жывуць у Слоніме, амаль штодня дабіраюцца на працу ў вясковыя школы.

На нарадзе ў жнíўні месяцы старшыня Слонімскага райвыканкама Аляксандр Пахолак паабяцаў настаўнікам, што ў верасні на працу з горада ў вёскі іх будуць падвозіць бясплатна.

Так яно і было. Але ўжо пад канец верасня настаўнікам заявілі, што з наступнага месяца ім прыйдзецца аплочваць 50% праезду, а астатнія 50% будуць пагашацца з мясцовага бюджэту. Але і да гэтай пары бюджэтныя грошы за праезд так і не паступілі. Іх абяцаюць выплаціць у якасці кампенсацыі да зарплаты, да 9-га лістапада. Праўда, як стала вядома карэспандэнту "ГС" ад аднаго з работнікаў раённага аддзела адукацыі, сам механізм налічэння гэтай кампенсацыі яшчэ не выпрацаваны. Але галоўная праблема ў тым, што ў многія вёскі раёна аўтобусы проста не ходзяць.

Педагогі дабіраюцца да месца працы і назад як папала і на чым папала. Як, скажам, налічваць кампенсацыю настаўніку, які ездзіць на працу ў Вішаўскую школу на ровары? У тыя ж Глоўсевічы таксама не ходзіць ніводзін аўтобус. Раней настаўніка падвозіў калгасны аўтобус бясплатна, а цяпер — толькі за грошы. Адзіны больш менш удалы — Міжэвіцкі накірунак. У той бок з верасня месяца па працоўных днях ходзіць аўтобус "Слонім — Востраба". Дарэчы, кошт білета да Вострава складаў (да падаражэння) у будныя дні 620 рублёў, а ў сераду на маршрутным "Слонім — Смаўжы" — напалову танней. Такія парадоксы цэнаўтварэння ў аўтобусным парку. Ды для настаўніка галоўнае — даехаць. А як даехаць у тую ж Сасноўку, куды па будных таксама не ходзіць ніводзін аўтобус? У Сянькоўшчынскім накірунку з нядаўняга часу пачаў штодзённа хадзіць аўтобус на Дзярэчын, але ў тыя ж, скажам, Хадзявічы ці Ганькі колькі яшчэ трэба настаўніку ад аўтобуса нагамі адмераць кіламетраў, каб дайсці да школы! Вяртацца назад — яшчэ большая праблема. А напярэдадні ж — зіма.

І атрымліваецца, што перад многімі з тых педагогаў, хто жыве ў горадзе, а працуе ў вёсцы, стаіць пытанне: як быць? Ці то працу пакідаць (а як без працы?), ці то і далей спадзявацца, што ўлады дапамогуць вырашыць фінансавыя і транспартныя праблемы.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАВІНЫ

Супрацьстаянне працягваецца

Тры месяцы працягваецца барацьба слонімскіх прадпрымальнікаў і райспажыўсаюза за цэнтральны гарадскі рынак.

Усе папярэднія звароты прыватных гандляроў да чыноўнікаў самага рознага ўзроўню — ад старшыні Белкаапсаюза да старшыні абласнога камітэта народнага кантролю — выніку не далі. Кіраўніцтва слонімскага райспажыўсаюза "з маніякальнай упартасцю прабівае рашэнне аб продажы рынку ў прыватныя рукі" без уліку патрабаванняў прадпрымальнікаў.

Наступны крок ініцыятыўнага савета прадпрымальнікаў гарадскога рынку — ліст-патрабаванне разабрацца ў канфліктнай сітуацыі да старшыні ўрада Беларусі спадара Навіцкага. Ці дасць гэта якія-небудзь станоўчыя вынікі, невядома. Але прыватныя гандляры настроены рашуча.

Зэльвенцы мерзнуць

На мінулым тыдні ў рэдакцыю "ГС" тэлефанавалі жыхары Зэльвы і гаварылі пра свае надзённыя праблемы. Галоўная з іх — ацяпленне дамоў.

У пасёлку "Паўночны", напрыклад, ацяпленне ўключаюць толькі з шасці гадзін вечара да раніцы. Астатні час батарэі застаюцца халоднымі. І гэта — у густанаселеным раёне, дзе працуюць дзіцячыя садкі.

Людзі скардзіліся, што дзеці мерзнуць і пачынаюць хварэць. Мясцовыя ж улады на звароты жыхароў не звяртаюць аніякай увагі. Вядома ж, у начальства свае мэты і прыярытэты — працягнуць зіму на той колькасці паліва, што ёсць, і далажыць "наверх", што ўсё добра.

Теперь дубинки не только у милиционеров

С недавнего времени патрульные комендатуры Слонимского гарнизона выходят на дежурство с резиновыми дубинками.

С чем это связано, и какие полномочия по применению дубинок имеют военнослужащие комендатуры? С этим вопросом корреспондент "ГС" обратился к сотруднику комендатуры капитану Игорю Куско. По словам Игоря Ивановича, инструкция о ношении дубинок была "спущена" из Минска. Для чего? Для более эффективного наведения общественного порядка, при необходимости.

Применение резиновых дубинок, как вообще всех спецсредств и оружия, строго регламентировано инструкцией. К тому же, по каждому факту незаконного применения обязательно составляется рапорт и проводится служебное расследование.

— Но пока что, — отмечает Игорь Куско, — в нашем гарнизоне применять дубинки не приходилось. Да и на каждом инструктаже перед выходом на дежурство солдатам постоянно напоминается, что лучше все-таки действовать уговорами, а не насилием.

Валерий КОВАЛЕНКО

З ЗАЛЫ СУДА

КВАТЭРА ЗАСТАЛАСЯ ЗА ЧАЛАВЕКАМ

Па рашэнню зэльвенскага суда ад 17 кастрычніка бягучага года не была задаволена іскавая заява Галынкаўскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм (ПМС-53) да жыхара пасёлка Кастрычніцкі Зэльвенскага раёна Уладзіміра Беладзеда на высяленне з кватэры, у якой ён жыве з 1993 года.

Пасля неаднаразовых адкладванняў і пераносаў слухання справы, суд пад старшынствам суддзі Зэльвенскага раёна Алы Іванаўны Бастун пастанавіў пакінуць жыллё за чалавекам. А пачатак гэта гісторыя бярэ ў 1994 годзе. Менавіта тады Уладзімір Беладзед завочна закончыў Горкаўскую сельгасакадэмію і быў прызначаны на пасаду майстра ўчастка ПМС-53.

Спачатку адносіны з дырэктарам прадпрыемства Міхаілам Дзмітрыевічам Валабуевым у маладога спецыяліста складваліся добрыя. На пасадзе майстра Уладзімір прапрацаваў чатыры месяцы і зарэкамендаваў сябе добрым, граматным работнікам. Магчыма, апошняе якраз і сталася прычынай таго, што начальнік паслаў яго на будоўлю гаража ў свой дом. Найперш, майстар павінен быў скласці каштарыс усіх будаўнічых работ — колькі і за што павінен заплаціць заказчык. Як расказаў сам Уладзімір, калі ён зрабіў усе падлікі і прынёс паперы Валабуеву, начальнік усклікнуў: "Ды ты ж мяне па свеце пусціш з такімі лічбамі...". Але нейкім чынам перайначваць каштарыс Беладзед адмовіўся. Працей кажучы, не прагнуўся пад шэфа. А ведаў пра справы апошняга занадта многа. Таму ў тым жа 1994 годзе, пабыўшы маладым спецыялістам усяго 4 месяцы, Уладзімір Беладзед быў звольнены з працы "па скарачэнню штату" разам з інжынерам прадпрыемства, галоўным бухгалтарам і некаторымі рабочымі. Хаця якраз маладых спецыялістаў па заканадаўству і ў той час не павінны былі звальняць. Але, калі ўжо найшла каса на камень, Уладзімір не стаў адстойваць месца працы ў Галынкаўскім ПМС-53 і ў хуткім часе пайшоў служыць кантрактнікам у Слонімскую брыгаду. Здаецца, на гэтым усё і павінна было б закончыцца. Але яшчэ ў 1993 годзе Беладзед атрымаў на сям'ю ордэр на жыллё ў пасёлку Кастрычніцкі па вуліцы Зялёная, 2, у памяшканні былой амбулаторыі, якая знаходзіцца на балансе Галынкаўскага ПМС-53. Уладзімір Уладзіміравіч сам зрабіў там капітальны рамонт, засяліўся з жонкай і дзецьмі на законнай падставе і, натуральна, быў прапісаны па месцу жыхарства. Але так здарылася, што ў сакавіку 2000 года Беладзед развёўся з жонкай. Яна пераехала з дзецьмі на жыхарства ў Слонім, а Уладзімір застаўся жыць у Кастрычніцкім. Вось тады дырэктар Галынкаўскага ПМС-53 Міхаіл Валабуеў зноў успомніў пра свайго былога незгаворлівага падначаленага і вырашыў пазбавіць апошняга жылля. У іскавай заяве ў суд Валабуеў піша: "Беладзед У.У. у 1994 годзе працоўную дамову скасаваў і ў цяперашні час працуе і жыве ў Слоніме...". Па-сутнасці, гэта заведамая хлусня, бо начальнік сам ставіў подпіс пад загадам аб звальненні былога падначаленага "па скарачэнню штатаў", а Беладзед і па сённяшні дзень прапісаны ў Кастрычніцкім. Смешнай выглядае і такая матывацыя Валабуева ў іскавай заяве, быццам бы, займаючы памяшканне былой амбулаторыі, Беладзед "перашкаджае нам ажыццяўляць гаспадарчую дзейнасць". У амбулаторыі і мясцовым аддзяленні Чырвонага Крыжа ёсць іншыя памяшканні.

Ды і ўвогуле, уся гэта судовая справа шыта белымі ніткамі. Урэшце, Уладзімір Беладзед яе выйграў. Але, як падзяліўся сваімі планамі ўчарашні адкаснік, цяпер ён сам будзе падаваць у суд іскавую заяву на вымяшчэнне маральных і матэрыяльных страт падчас судовай цяжбы.

Што ж, у гэтай гісторыі можна не толькі здзіўляцца настырнай самаўпэўненасці ў сваёй праваце і беспакаранасці начальніка, але і аддаць належнае Уладзіміру Беладзеду, які не апусціў рукі і абараніў сваё законнае права на жыллё.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

Цягнік пакалечыў мужчыну

На 93-м чыгуначным перагоне Азярніца – Зэльва адбыўся наезд цягніка на жыхара Зэльвы.

За некалькі метраў да здарэння машыніст цягніка ўбачыў п'янага чалавека, які ляжаў на зямлі, паклаўшы ногі на рэйкі. Рэзкае тармажэнне не дапамагло – цягнік адрэзаў мужчыне правую нагу і пакалечыў левую. Траўміраваны быў дастаўлены ў рэанімацыю Зэльвенскай бальніцы.

Дзмітрый ДРОЗД, ст.лейтэнант міліцыі

Пабіліся сваякі

У вёсцы Елка Зэльвенскага раёна за чаркаю пачалі высвятляць свае адносіны мясцовыя жыхары.

Адзін з іх схапіў нож і ўсадзіў яго ў жывот свайму сваяку, якога даставілі ў бальніцу.

Па нявядомых прычынах нехта са сваякоў яшчэ падпаліў прыватную машыну. Па гэтых фактах узбуджана крымінальная справа.

"Майстар" на ўсе рукі

Самым сапраўдным ашуканцам аказаўся адзін з выкладчыкаў Слонімскага вучэбна-вытворчага камбіната.

Майстар ухітрыўся пакласці ва ўласную кішэню больш за 180 тысяч рублёў. І гэтыя грошы былі ні чые-небудзь, а яго вучняў.

Сяргей ЧЫГРЫН

НОВАЕ ВЫДАННЕ

СЛОНІМ НА СТАРЫХ ПАШТОЎКАХ



У Слонімскай друкарні пабачыў свет буклет "Слонім на старых паштоўках", які падрыхтавала да выпуску дырэктар мясцовага раённага краязнаўчага музея Ірына Шпыркова.

Выпуск старых паштовак Слоніма прымеркаваны да 750-годдзя з таго часу, калі першы раз упамінаецца наш горад пад назваю Услонім у Іпацеўскім летапісе. Гэтую дату слонімцы адзначаць у наступным годзе.

Буклет складаецца з 24 фотаздымкаў. На іх адлюстраваны віды Слоніма, выкананыя ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў мясцовымі фатографамі Б. Вайнштэйнам і Г. Браўнам.

Ірына Шпыркова зрабіла вельмі цікавы і арыгінальны падбор здымкаў старога Слоніма. Некаторыя здымкі раней нават нідзе не публікаваліся. Напрыклад, рыбны кірмаш на Школьнай вуліцы ў 1916 годзе, пажар у Слоніме ў 1918 годзе і іншыя. Старых здымкаў пра горад над Шчарай захавалася і захавалася да сённяшняга дня вельмі шмат. Добра было б выпусціць яшчэ некалькі падобных буклетаў са старымі паштоўкамі Слоніма.

Сяргей ЧЫГРЫН



НАВІНА

ФЕСТЫВАЛЬ СЯМЕЙНАЙ ТВОРЧАСЦІ АДБУДЗЕЦЦА Ў НАШЫМ ГАРАДЗЕ

21-23 снежня ў Слоніме і ў Слонімскім раёне адбудзецца Трэці Рэспубліканскі фестываль сямейнай творчасці.

Ён будзе праводзіцца з мэтай павышэння сацыяльнага статусу, ролі і значнасці сям'і ў грамадстве.

У ім прымуць удзел лепшыя калектывы сямейнай аматарскай мастацкай творчасці рэспублікі па ўсіх відах і жанрах народнага мастацтва, у тым ліку дэкаратыўна-прыкладнога, пекарскага і інш.

У межах фестывалю будуць арганізаваны конкурсы сямейнага сцэнічнага мастацтва "Зіхаці талентам, дружная мая сям'я", дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Сям'я-рукатворніца", сямейнага песеннага майстэрства "Ліся, песня і прыпеўка", інструментальнага мастацтва "Гучы, мелодыя, гучы", пекарскага ўмельства "Беларускі каравай", аматарскіх відэафільмаў "Мая сям'я", дэманстрацыйны паказ беларускага нацыянальнага рэгіянальнага касцюма.

Ва ўсіх конкурсных намінацыях журы вызначыць па аднаму сямейнаму калектыву, які атрымае званне "Лаўрэат фестывалю".

У склад журы Трэцяга Рэспубліканскага фестывалю сямейнай творчасці ўвайшлі вядомыя дзеячы беларускай культуры. Сярод іх – мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Г. Цітовіча Міхаіл Дрынеўскі, народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка, пісьменнік Уладзімір Ліпскі, доктар мастацтвазнаўства Яўген Сахута і іншыя.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПОЧТА

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ОБМАНУЛ

С 1 по 22 октября наша бригада из 14 человек убирала картофель в колхозе «Рассвет» Зельвенского района. Когда нас принимали на работу, председатель колхоза Хорута В.В. с нами письменного договора не заключал, а только на словах.

Мы с ним согласились: за одну тонну убранного картофеля он пообещал нам платить 4500 рублей. Плюс ко всему нам разрешалось брать по ведру бульбы домой (за ведро 800 руб.). А рассчитываться председатель с нами будет после каждой отработанной недели.

Наша бригада все эти условия строго выполняла. В краже мы замечены не были. Несколько раз нас высаживали из автобуса, чтобы проверить. А также постоянно следили за нами на уборочном поле.

И что вы думаете – председатель нас обманул. Еженедельно он с нами не расплачивался. А за последние 12 дней работы начислил нам по... 492 рубля. Спросили: почему так получилось? Оказалось, что за ведро картофеля колхоз с нас высчитал не по 800 рублей, как мы договаривались, а по целых 1400.

Помогите в этом вопросе нам разобраться и вернуть наши честно заработанные деньги.

ПЕТЛИЦКИЙ Е.Н., КРИЦКИЙ С.С., ЛИХАЧ Н.В., ЖУК М.М., МОРОЗ Р.В., ПЕТРЕНКО Р.П., ГОРБАЧЁВА Т.Т. и другие, всего 14 подписей.

дабрачыннасць

ВЕЛАСІПЕДЫ Ў ДЗЯРЭЧЫНЕ – БЯСПЛАТНЫЯ

Даведаўшыся, што ў мясцовым касцёле вёскі Дзярэчын Зэльвенскага раёна амаль бясплатна выдаюць людзям веласіпеды, мы вырашылі ўпэўніцца ў гэтым самі.



Ксёндз Дзярэчынскага касцёла Юзаф Файлер

Загадзя дамовіўшыся з ксяндзом Юзафам Файлерам аб сустрэчы, у мінулую суботу карэспандэнты "ГС" завіталі ў гэтае прыгожае мястэчка.

Сышоўшы ў дзевяць гадзін з прыступак прыгараднага аўтобуса, мы пацішу пакрочылі па туманных вуліцах старажытнага Дзярэчына. Вёска ўжо даўно прачнулася, працавалі калгасныя канторы, адчыняліся крамы. А на адной з вуліц вёскі ўжо гандлявалі прыватнікі. Яны прадавалі абутак, адзенне для вяскоўцаў, а таксама садавіну паўднёвых краін і ласункі. Да гандляроў пад'язджалі на веласіпедах вяскоўцы. Адны нешта куплялі, другія – проста цікавіліся таварам. У Дзярэчыне, сапраўды, усе мясцовыя жыхары ездзяць на двуколках. Прычым, не на нашых айчынных, а на нямецкіх.

І вось Дзярэчынскі касцёл. Вакол яго па-еўрапейску добраўпарадкавана тэрыторыя, пабудавана некалькі прыгожых дамоў. У адным з іх жыве настаяцель Дзярэчынскага касцёла Юзаф Файлер. Ён шчыра запрасіў нас у дом, дзе і адбылася гутарка.

— Брат Юзаф, людзі кажуць, што Вы раздалі бясплатна жыхарам Зэльвеншчыны каля адной тысячы веласіпедаў, якія касцёл атрымаў у якасці гуманітарнай дапамогі?

— Гэта так. Ровары выдаваліся не толькі прыватным асобам, але і прыходам, прадпрыемствам і калгасам Зэльвенскага, Мастоўскага і нават Слонімскага раёнаў. Я выдалі іх па спісу дзесьці каля адной тысячы штук.

— А каму адмаўляеце ў выдачы веласіпедаў?

— Найперш тым, хто любіць зазірнуць у чарку.

— Вы асабіста вырашаеце, каму падараваць веласіпед?

— Я адзін нічога не вырашаю. Размеркаваннем веласіпедаў і іншай гуманітарнай дапамогі займаецца камісія з 6-ці прыхаджанаў. А выдаю іх я і дзве манашкі – полька і армянка. Мы належым да ордэна Самарыцянаў. У першую чаргу веласіпеды атрымалі калгаснікі, якім трэба ездзіць на працу ў поле ці на сенажаць, а таксама дзеці, якім далёка дабірацца да школы. Просяць веласіпеды і тыя, у каго ёсць машына ці матацыкл, даем і ім.

— Гэта новыя веласіпеды?

— Не. Некалькі чалавек пры касцёле іх рамантуе, і людзі атрымліваюць толькі тыя веласіпеды, на якіх можна ездзіць. Мы даем гарантыю эксплуатацыі – шэсць месяцаў.

— І няўжо ніхто з тысячы чалавек касцёлу не заплаціў ні капейкі?

— З некаторых асоб чыста сімвалічна мы бралі па 5-10 тысяч рублёў. Гэтыя грошы пайшлі на аплату транспарціроўкі веласіпедаў з Германіі.

— А ў Германіі хто іх збірае і адпраўляе ў Дзярэчын?

— Мой родны брат.

— Ці ёсць на сённяшні дзень жадаючыя атрымаць бясплатна веласіпеды?

— Ёсць, каля двух тысяч чалавек.

— І няўжо яны атрымаюць?

— Адназначна адказаць не магу. Але 500 ровараў нам зноў хутка прывязуць з Германіі.

— Акрамя веласіпедаў, якую яшчэ гуманітарную дапамогу прыхаджанам аказвае касцёл?

— Дапамагаем адзеннем, харчаваннем. На каляды заўсёды рыхтуем дзецям падарункі, дапамагаем бальніцы. А ў каго здарыўся пажар – мэбляй.

— У Дзярэчыне ёсць яшчэ праваслаўная царква. У якіх Вы адносінах з бацюшкам?

— У добрых. Разам паставілі ў цэнтры вёскі два крыжы – праваслаўны і каталіцкі. Часам сустракаемся, гутарым. Але праваслаўныя вернікі папракаюць бацюшку мною: маўляў, ксёндз больш робіць для людзей, чым ён. Што ж, гэта справа вернікаў.

— Значыць, з жыхарамі Дзярэчына Вы знайшлі агульную мову?

— Відаць, так. За сем гадоў жыцця ў Дзярэчыне я вывучыў менталітэт беларусаў, іх адмоўныя і станоўчыя бакі. Добра вывучылі і яны мяне: што я за чалавек, які ў мяне характар, норавы і г.д.

— А да прыезду ў Дзярэчын дзе Вы жылі і працавалі?

— Я вучыўся дзевяць гадоў у Рыме, а пасля год працаваў у Італіі. З Італіі прыехаў на Беларусь.

— Брат Юзаф, Вы не шкадуеце, што трапілі на Беларусь?

— Я па ўласнаму жаданню прыехаў да вас і, шчыра кажучы, ніколькі аб гэтым не шкадую.

Сяргей ЧЫГРЫН

падарожжа

УКРАІНА ПАКЛІКАЛА НА СВЯТА

У Заходняй Украіне адбылося міжнароднае царкоўнае свята "Прощі Верваці". На ім пашанцавала быць і мне.



У час свята на Украіне



На гэтае свята з'ехаліся дэлегацыі з Чэхіі, Славакіі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Беларусі, Расіі і, вядома, з усёй Украіны.

Ад Беларусі было тры аўтобусы: два мінскія аб'ядноўвалі прадстаўнікоў з Полацка, Магілёва, Навагрудка, Мінска, і мы – гарадзенцы.

Спачатку мы наведалі Львоў. Пазнаёміліся з яго культурнымі помнікамі. Горад еўрапейскі, прыгожы і цікавы. Удалося пабываць на Галіцкім кірмашы, дзе прадаваліся прадукты харчавання. Кірмаш уразіў багаццем і разнастайнасцю тавараў. Тут былі каўбасы і вяндліна, сала і алей, грыбы і вінаград, грэцкія арэхі і мёд, бульба і кукуруза, пшаніца і г.д. Сотні духмяных траў, кветак! І кожны гандляр запрашаў да сябе, даваў паспрабаваць на смак сваю ежу. І калі я сказаў, што тую ж каўбасу можна і не купляць, а так, накаштаваўшыся, наесца, дык прыгажуня-прадаўшчыца адказала: "Еще на здароўе."

Няма тут мянялаў, як у нас, усюды канторкі "Абмен валюты". Тут мяняюць грошы ўсіх краін свету, акрамя нашых, беларускіх. Усё каштуе танней, чым у нас: цукар, алей, вінаград, арэхі. Танней усе харчовыя прадукты, асабліва танныя віно і гарэлка. Разам з гарэлачнымі вырабамі ў дзяржаўных магазінах з акцызнай маркай прадаецца першак і 40, і 50, і болей градусаў. Вядома ж, іх віны ніяк не параўнаеш з нашымі "Яблыкамі" і "Дажынкамі". Вядомае свету па якасці віно "Кагор" каштуе 7 грыўняў і 50 грошай за бутэльку (крыху больш за адзін даляр). І яшчэ адна дэталь. Пры такім багацці харчовых прадуктаў і гандляроў – не было бачна міліцыі. "Чаму так?" – запытаў я чалавека, які ўвіхаўся, прадаючы свой тавар. Ён адказаў: "А ў нас са з'яўленнем прыватнай гаспадаркі перасталі красці."

Мяне гэта заставіла задумацца і шукаць грунтоўны адказ. Далейшае падарожжа мне дапамагло ў гэтым.

З Львова мы накіраваліся ў Крылас, што на Галіччыне. У час падарожжа я бачыў багатыя сёлы з прыгожымі і шыкоўнымі дамамі. Дамы, у асноўным, вялікія і дагледжаныя. Ёсць і меншыя, але ўсе прыгожа аздобленыя. З болем на сэрцы параўноўваў іх з нашымі беларускімі хаткамі і нават з тымі, якіх на вёсцы называем "катэджамі". У кожным украінскім сяле пабудавана новая царква. І палі дагледжаныя, усе апрацаваныя. У кожнай гаспадарцы, вядома ж уласнай, свая пара коней, некалькі кароў, авечкі, шмат гусей.

Можа хто паспрабуе пярэчыць? Дык каму ж не вядома, што і ў Беларусі на Гарадзеншчыне і Брэстчыне людзі лепш жывуць, чым на Віцебшчыне. Але ж жыццё вельмі кароткае, і хацелася б, каб і беларусы ўбачылі святло.

Я не змог зразумець, чаму на Украіне такі танны бензін? Ён жа і там расійскі. А мы з Расіяй у такім саюзе. Дык чаму ён для нас дарагі?

Мы ў Крыласе. Крылаская гара, дзе адбылося свята, была галоўнаю цвярдыняю Галіцкага княства – цэнтрам летапіснага Галіча. Вось тут і адбылося міжнароднае свята, прысвечанае яўленню іконы Прачыстай Дзевы Марыі. Засталося вельмі прыемнае ўражанне. Я ўпершыню ўбачыў, з якой пашанаю людзі адносяцца да нас, беларусаў, да нашай беларускай мовы. І калі на святочным прыёме, дзе сабраліся дэлегацыі многіх народаў (а запрошана было больш за 2 тысячы асоб), заспяваў па-беларуску хор "Бацькаўшчына" з Гродна, усе прысутныя ўсталі. А калі гучала песня на словы М.Багдановіча, дык спявалі ўсе. Усе стараліся спяваць па-беларуску: і чэхі, і славакі, і літоўцы, і латышы... Слёзы з вачэй пацяклі ад радасці. І ўсплыло новае пытанне: "А чаму ж на Радзіме не ўсе гэта разумеюць, чаму ў свеце мова наша ўспрымаецца добра, цэніцца?"

Янка КАРПОВІЧ

НАВІНЫ

Требуются таланты

В мае этого года одному талантливому человеку в Слониме, Тимуру Куцу, пришла в голову идея создать литературную газету. И этот человек, найдя авторов, финансы и помощников, эту идею осуществил.

Детище его называется "Look Ahead", выходит на восьми страницах, достаточно небольшим тиражом, распространяется по Беларуси и пользуется популярностью у увлеченных. В ближайшей перспективе – третий номер к концу ноября. Из этого занятия родилась еще одна идея: создать объединение творческих людей. И эта задумка нашла свое воплощение в жизни. Ребята собираются в помещении центра социального обслуживания "Доверие". В организации им помогает Яна Мельникова, сотрудница вышеупомянутого центра. На последнем заседании присутствовало всего пять молодых авторов. Но, несмотря на малое количество пришедших, было интересно. Ребята читали свои произведения, обсуждали их.Объединение еще не зарегистрировано, да и название пока только в стадии обсуждения, но, судя по энергии и увлеченности юных творцов, у их задумки есть будущее.

Ребята собираются и ждут новых друзей каждую пятницу, в 16.00, в доме №42 по улице К.Маркса, на втором этаже, в центре "Доверие".

Светлана ЮХИМЕНКО

Падарункі за доўгае жыццё

У Слоніме і раёне зараз жыве 12 чалавек, якім споўнілася 100 і больш гадоў.

Па 108 гадоў, напрыклад, пражылі на свеце Ганна Паўлаўна Міхальчык з вёскі Падгорная і Пётр Пятровіч Гаркавы са Слоніма. Нядаўна Слонімскі аддзел сацыяльнай абароны насельніцтва павіншаваў мясцовых доўгажыхароў і выдаткаваў на падарункі 900 тысяч рублёў.

Мікола КАНАНОВІЧ

Трубы не вытрымліваюць

Ацяпляльны сезон прынёс мастоўскім камунальнікам мноства непрыемнасцей.

На мінулым тыдні прарвала трубу перад будынкам раённага суда. Мастаўчане зноў засталіся без ацяплення, а заадно – і без гарачай вады, хаця быў складзены графік яе падачы па выхадных днях.

Адстаўка генеральнага

Наглядальны савет ААТ "Мастоўдрэў", які праходзіў на мінулым тыдні, задаволіў просьбу генеральнага дырэктара Віктара Бурага аб звальненні яго з працы па стану здароўя.

Зараз яго абавязкі выконвае тэхнічны дырэктар прадпрыемства Новікаў. Вылучэнне кандыдатаў на пасаду кіраўніка ААТ "Мастоўдрэў" адбудзецца ў бліжэйшы час.

Семінары ў Мастах

На мінулым тыдні ў Мастах прайшлі два семінары: педагагічны і Свабодных прафсаюзаў.

З усёй вобласці з'ехаліся намеснікі загадчыкаў раённых аддзелаў адукацыі разам з загадчыкамі раённых вучэбна-метадычных кабінетаў. Удзельнікі настаўніцкага семінару наведалі сельскія школы ў вёсках Стубніца і Гудзевічы, а таксама гарадскія СШ №1 і №5. Яны пабывалі на ўроках і пазакласных мерапрыемствах, а таксама наведалі школьныя музеі. На семінары Свабодных прафсаюзаў удзельнікі пазнаёміліся з правамі і абавязкамі сяброў прафсаюзных арганізацый.

Язэп ПАЛУБЯТКА

КРЕДИТЫ БУДУТ ДАВАТЬ ПО-НОВОМУ

В Беларуси внесены изменения и дополнения в порядок и условия предоставления гражданам льготных кредитов на строительство (реконструкцию) или приобретение жилых помещений. Указ о внесении таких изменений и дополнений подписал президент Александр Лукашенко.

Этот документ, как отмечается в официальном комментарии, подготовлен с учетом "большого количества замечаний и обращений граждан, принимавших участие в строительстве или приобретении жилья с государственной поддержкой".


Указ уточняет ряд положений, регламентирует порядок предоставления льготных кредитов на строительство (реконструкцию) или приобретение жилья за счет средств льготных целевых бюджетных жилищно-инвестиционных фондов. Помимо этого, детализируется порядок установления нормируемых размеров общей жилой площади строящегося жилья для определения величины льготного кредита с учетом жилья, находящегося в собственности гражданина и членов его семьи или отчужденного кредитополучателем (членами его семьи) в течение трех лет до заключения кредитного договора.

Указом также уточнены категории граждан, имеющих право на внеочередное получение льготных кредитов и на совместное использование льготного кредита и одноразовой безвозмездной субсидии. Регламентирован порядок учета случаев продажи кредитополучателем имеющегося в его собственности жилья.

Вызывавший наибольшее количество жалоб кредитополучателей порядок отнесения новых условий предоставления льготных кредитов на ранее заключенные кредитные договоры уточнен в пункте восьмом указа: новые условия кредитования распространяются на вновь заключаемые кредитные договоры и кредитные договоры, заключенные до вступления в силу настоящего указа, по которым кредиты не выдавались.

БелаПАН

ОСТАВЯТ ЛИ ЛЬГОТЫ ДЛЯ МИЛИЦИОНЕРОВ?


Фото REX / ProMedia

Потери государства от предоставления льгот на проезд в транспорте составляют 70—75 миллиардов рублей. Об этом на пресс-конференции заявил министр транспорта и коммуникаций Беларуси Михаил Боровой.

По его словам, сегодня в Беларуси 5,2 миллиона человек пользуются транспортными льготами. Фактически 65 процентов населения Беларуси перевозится бесплатно. Государство вынуждено дотировать перевозки, однако, как отметил Боровой, в случае отказа от предоставления льгот не нужно было бы и осуществлять дотации транспортной отрасли. По мнению министра транспорта, категории и саму систему предоставления льгот на проезд в пассажирском транспорте необходимо пересмотреть. "Сегодня сотрудник органов внутренних дел получает зарплату больше рабочего, больше служащего и так далее. А кто-то за него платит", — отметил М.Боровой и подчеркнул, что система предоставления льгот должна быть адресной. Что касается тарифов на внутригородские перевозки, то они в Беларуси, по данным транспортников, и вовсе едва ли не самые низкие в мире. Они ниже, чем на Украине, в России, Прибалтике. В результате такой тарифной политики у транспортников отсутствуют средства на обновление пассажирского автотранспортного парка. Свыше 70 процентов единиц транспортного парка республики эксплуатируются более 7 лет.

Алексей ОРЕШКО

В БЕЛАРУСИ ПРОДОЛЖАЕТСЯ УСКОРЕНИЕ ТЕМПОВ ИНФЛЯЦИИ

По данным Министерства статистики и анализа, за первые три недели октября рост потребительских цен в стране составил 2 процента (за первую неделю — 1 процент, за вторую — 0,4, за третью — 0,6).

Для сравнения: за первые три недели сентября цены увеличились на 1,5 процента (по итогам месяца — на 2,1), августа — на 0,8 (на 0,8), июля — на 1,4 (на 1,6), июня — на 1,9 (на 2,1), мая — на 1,8 (на 2,6).

С начала года потребительские цены в Беларуси выросли на 30,5 процента (за этот же период 2000 года — на 84,3 процента, в т.ч. за первые три недели октября — на 3,5 процента).

Дмитрий ВЛАСОВ

ЗАРПЛАТА СНИЗИЛАСЬ

После президентских выборов в Беларуси снизилась средняя начисленная зарплата рабочих и служащих — со 102,8 доллара США в августе до 98,8 доллара США в сентябре (в пересчете по рыночному наличному курсу).

По данным Министерства статистики и анализа, в рублевом выражении зарплата снизилась за месяц на 2,6 процента (со 150.854 до 147.001 рубля). В то же время рыночный наличный курс доллара США повысился на 1,4 процента, а потребительские цены — на 2,1. Для сравнения: в августе зарплата выросла на 2,75 доллара, в июле — на 7,4.

С начала года средняя начисленная зарплата рабочих и служащих выросла на 59,9 процента в номинальном выражении и на 25 процентов — в реальном (с учетом официальной инфляции). Темпы роста рублевой зарплаты по итогам девяти месяцев оказались выше темпов роста наличного курса доллара США на 31,2 процента.

БелаПАН

МИНФИН РАЗРАБАТЫВАЕТ НОВЫЙ БУХУЧЁТ

Государственное регулирование бухгалтерского учета и отчетности в Беларуси будет осуществлять Министерство финансов Беларуси.

Помимо этого, правительство своим постановлением возложило на Минфин разработку и утверждение типовых унифицированных форм первичной учетной документации.

Республиканским органам государственного управления, объединениям, подчиненным Совмину, поручено до 1 декабря 2001 года утвердить альбомы унифицированных форм первичной учетной документации, регистров бухгалтерского учета и их электронные версии для соответствующих видов деятельности и отраслей экономики. Юридическим лицам независимо от формы собственности и индивидуальным предпринимателям поручено применять с 1 января 2002 года альбомы унифицированных форм первичной учетной документации, регистров бухгалтерского учета и их электронные версии для соответствующих видов деятельности и отраслей экономики, если иной порядок ведения бухгалтерского учета не установлен актами законодательства.

БелаПАН

ПРЕДПРИНИМАТЕЛИ ТРЕБУЮТ ГАРАНТИРОВАННЫЙ ОТПУСК

Профсоюзы и общественные объединения индивидуальных предпринимателей Витебской области намерены инициировать изменение порядка выплат в Фонд социальной защиты, сообщает Федерация профсоюзов Белорусская.

По их мнению, действующий сегодня механизм уплаты взносов на социальное страхование неприемлем, поскольку "выплаты в размере 15 процентов от товарооборота в Фонд социальной защиты приведут к разорению большинства индивидуальных предпринимателей". Представители предпринимательских профсоюзов предлагают установить для индивидуальных предпринимателей, работающих по твердым ставкам подоходного налога, отчисления в Фонд социальной защиты в размере 36 процентов минимальной заработной платы, или 6 процентов от уплачиваемой твердой ставки подоходного налога. Помимо этого, предпринимательские профсоюзы предлагают восстановить индивидуальным предпринимателям трудовой стаж с момента выдачи свидетельства о регистрации, а также признать за ними право на гарантированный отпуск без обязательства уплачивать за время него налоги и арендные платежи.

БелаПАН

НОВОВВЕДЕНИЕ В БАНКОВСКУЮ СИСТЕМУ



После прохождения правовой экспертизы, вступит в силу постановление правления Национального банка Беларуси "О текущих (расчетных) счетах обособленных подразделений юридических лиц".

Как сообщили в Нацбанке, в постановлении отмечается, что при реорганизации банка или изменении его структуры, в том числе в случае прекращения деятельности его обособленных и структурных подразделений, юридическим лицам разрешается сохранять текущие (расчетные) счета, открытые до вступления в силу Банковского кодекса (1 января 2001 года. — БелаПАН.) для обособленных подразделений, выделенных на отдельный баланс. Текущие (расчетные) счета обособленным подразделениям открываются в любом банке по выбору клиента в порядке, предусмотренном соответствующими правилами.

БелаПАН

ЛИЦЕНЗИЙ УМЕНЬШИТСЯ

Перечень лицензируемых видов деятельности планируется сократить со 165 до 38.

Такое предложение содержится в проекте, подготовленном специальной рабочей группой, сформированной весной 2001 года по решению бывшего премьер-министра Владимира Ермошина. Об этом 26 октября, отвечая на вопросы парламентариев в Палате представителей Национального собрания Беларуси, сообщил министр экономики Беларуси Владимир Шимов.

Сокращение видов лицензирования, сказал министр, будет осуществляться "посредством их исключения и объединения". Кроме того, по словам В.Шимова, проработан вопрос о дальнейшем сокращении видов лицензируемой деятельности "посредством замены лицензирования другими методами государственного регулирования". Однако, отметил он, этот процесс будет происходить поэтапно.

В ближайшее время сокращенный перечень лицензируемых видов деятельности будет направлен в парламент для включения его в проект закона "О лицензировании в Республике Беларусь".

Этот документ устанавливает основные принципы лицензирования, основания введения лицензирования, компетенцию лицензионных органов, требования и условия и порядок выдачи лицензий, приостановления и прекращения их выдачи, а также механизм контроля и надзора за этим процессом.

По словам В.Шимова, данный законопроект направлен на обеспечение в Беларуси единой политики в области лицензирования "в целях защиты жизни и здоровья граждан, их прав и законных интересов, охраны окружающей среды, обеспечения обороноспособности и безопасности государства".

Юрий ПОТЕМКИН

Иран

МАСКИРУЮТ СПУТНИКОВЫЕ ТАРЕЛКИ ПОД КОНДИЦИОНЕРЫ



За два дня иранская полиция конфисковала у частных лиц более тысячи спутниковых тарелок, сообщает Associated Press со ссылкой на официальную газету Ирана "Iran".

В ближайшее время власти намереваются изъять у граждан страны еще 150 тысяч. Это делается в рамках осуществления новой политики государства по ограничению доступа к некоторым каналам, трансляция которых ведется из США, и которые находятся в распоряжении оппозиционных группировок Ирана. Анонимный источник в полиции сообщил, что операция по массированному изъятию спутниковых систем была проведена в четверг и пятницу.

